СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 6(104), 14-20. 2. 2008 г.

# НАДЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭННЕ Ў ВОЙСКУ

## НАВАБРАНЕЦ АДМОВІЎСЯ ПРЫМАЦЬ ПРЫСЯГУ

9 лютага ва ўзброеных сілах Беларусі адбылася ўрачыстая прысяга прызыўнікоў. А ў вайсковай частцы ў Жлобіне цырымонія пайшла не па запланаваным сцэнары. Калі дайшла чарга да Змітра Жалезнічэнкі, ён выйшаў з шэрагу і абвясціў, што прысягаць не будзе.

Пазней ён патлумачыў, што не адмаўляецца ад службы ў войску, але патрабуе, каб яму спачатку далі скончыць універсітэт, у якім ён вучыўся.

У той момант хлопец яшчэ не ведаў, што яго бацькі прывезлі з сабой у вайсковую частку пастанову суду аб прыпыненні яго прызыву як незаконнага. Камандаванне вайсковай часткі, аднак, параіла звяртацца ў ваенкамат, у прызыўную камісію. Далі зразумець, што рашэнні цывільнага суду для войска не закон.

Навабранца з вайсковай часткі не выпускаюць, даручаюць яму займацца living рознымі дапаможнымі работамі.

Пра Змітра Жалезнічэнку газета “Свабода” не аднойчы пісала раней. Але ёсць сэнс нагадаць перадгісторыю гэтага надзвычайнага здарэння ў Жлобіне.



**Падчас прысягі.** *Мінск, 9 лютага 2008 году.*

Летась студэнт-выдатнік 2-га курсу матфака Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Скарыны быў адлічаны рэктарам за пропуск заняткаў “з непаважнай прычыны”. Жалезнічэнка, між тым, правёў некалькі сутак у міліцэйскім пастарунку. Падстава адміністрацыйнага арышту была стандартная – дробнае хуліганства. Студэнт, нібыта, лаяўся матам. Перад тым пракуратура спрабавала ўзбудзіць справу ў сувязі з тым, што ён распаўсюджваў білеты на канцэрт беларускіх бардаў у Гомелі. (Нехта данёс у “органы”, быццам Зміцер нешта з гэтага атрымаў.) Справа скончылася нічым.

Сёлета раённы суд у Гомелі прызнаў адлічэнне студэнта незаконным з фармальных прычынаў. Тады прафкам універсітэта задняй датай ухваліў загад рэктара аб звальненні Жалезнічэнкі. Тым часам хлопца ўжо забралі ў войска.

Перад тым ваенкамат накіраваў яго на псіхіятрычную экспертызу – у сувязі з тым, што Жалезнічэнка размаўляе і піша па-беларуску. У войску Зміцер адразу абвясціў галадоўку. Яго накіравалі ў



**З.Жалезнічэнка.** *Фота В.Адзіночанкі, дацэнта ДГУ імя Скарыны.*

шпіталь на абследаванне. Дактары прыйшлі да высновы, што яму патрэбнае лекаванне і адтэрмінаванне ад службы на паўгода.

Суд у Гомелі пастанавіў прыпыніць прызыў Жалезнічэнкі ў войска. Але ў ваенкамаце кажуць, што пастанова спазнілася – маўляў, цягнік пайшоў.

Учынак прызыўніка, які адмовіўся прымаць прысягу, прыцягнуў да яго ўвагу грамадскасці ў Беларусі.

**Аглядальнік**

**Працяг тэмы на стар. 2**

## СКАНДАЛ ВАКОЛ “КАРТЫ ПАЛЯКА”

КАМЕНТАР ВАЛЕРЫЯ ФІЛІНА НА СТАР. 4

### ПАЛІНА КАЧАТКОВА

## ПРА “ХРЭНОЎКУ” НА РАСІЙСКІМ СПІРЦЕ

НА СТАР.5

# ЯК ВЫ АЦЭНЬВАЕЦЕ АДМОВУ ЗМІТРА ЖАЛЕЗНІЧЭНКІ ПРЫНЯЦЬ ВАЙСКОВУЮ ПРЫСЯГУ?

**ВАЛЕРЫ ФРАЛОЎ, ГРАМАДСКІ ДЗЯЯЧ, ГЕНЕРАЛ У АДСТАЎЦЫ:**

## "ГЭТА ПАЛІТЫЧНЫ ПІЯР"

Ёсць краіна, падабаецца яна ці не падабаецца. І ёсць такое паняцце, як абарона Радзімы. І не трэба блытаць гэта з абаронай мовы. Учынак Жалезнічэнкі – гэта палітычны піяр. Я сумняваюся ў шчырасці ягоных памкненняў. Я вельмі крытычна стаўлюся да некаторых нашых дзеячоў, якія на першы план ставяць падобныя мэты. Абарона Радзімы павінна быць. Ад таго, што гэты хлопец прыйшоў у войска, войска па-беларуску не загаворыць. І мова – не дастатковая падстава, каб не прымаць прысягі.

**ВАДЗІМ, БАНКАЎСКІ РАБОТНІК:**

## "ГЭТА ВЕЛЬМІ МУЖНЫ ЎЧЫНАК"

Гэта вельмі мужны ўчынак Змітра Жалізнічэнкі. Бо пацан пайшоў супраць усіх. І, галоўнае, супраць агульнапрынятай думкі, што, маўляў, войска – гэта святое, "хто не служыў – той не мужык". А яшчэ ён стварыў прэцэдэнт для будучых прызыўнікоў і будучы галаўны боль для генералаў. Бо крыць ім няма чым.

**ГАРЫ ПАГАНЯЙЛА, ЮРЫСТ:**

## "ПАВОДЛЕ ЗАКОНУ ЁН НЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВАЙСКОЎЦАМ"

Мы з калегамі непасрэдна вядзем справу Жалезнічэнкі, аказваем яму прававую дапамогу. Ён не прыняў прысягу таму, што фактычна на сёння адносна яго не дзейнічае закон аб прызыве на вайсковую службу. Рашэннем суддзі ад 1 лютага 2008 году прыпынена рашэнне прызыўной камісіі аб прызыве Жалезнічэнкі на тэрміновую вайсковую службу. Таму ён не з'яўляецца вайскоўцам. Іншая справа, што армейскія камандзіры і ваенком не хочуць выконваць судовае рашэнне. Адмова прымаць прысягу – гэта грамадзянскі, мужны ўчынак. Правільны ўчынак. І я думаю, што справа вырашыцца ў судзе на карысць Жалезнічэнкі.

**ВАЛЯНЦІНА, НАСТАЎНІЦА:**

## "ГЭТА ВЫКЛІК СІСТЭМЕ"

У любым выпадку, гэта выклік. Гэта выклік тым людзям, якія яго паставілі ў такую сітуацыю. Гэта выклік нашай сістэме. Чым бы ні быў прадыктаваны гэты выклік, ён заслугоўвае павагі. Бо чалавек не паплыў па цячэнні, а пайшоў адзін супраць усіх. Кожны не толькі мае, але абавязаны абараняць свае правы.

**АЛЕГ ДАШКЕВІЧ, ТЭЛЕЖУРНАЛІСТ:**

## "КАМУСЬЦІ ТРЭБА ПАДЫМАЦЬ ПЫТАННЕ МОВЫ"

Камусьці трэба падымаць пытанне мовы ў войску. Гэта ўчынак адчайны. Я не ведаю, чым ён прадыктаваны. Але гэта знакавы ўчынак. Таму што дагэтуль так жорстка ў войску гэтае пытанне не ставілася. Былі агульныя размовы, што, маўляў, даўно трэба, былі асветніцкія ініцыятывы колішняга Беларускага згуртавання вайскоўцаў, складанне слоўнікаў і гэтак далей. А тут адзін чалавек узяў і адмовіўся. І тым самым паставіў праблему капітальна. Па-першае, перад чынавенствам, а па-другое, перад грамадствам.

**СЯРГЕЙ, ПЕНСІЯНЕР:**

## "УСЕ МЫ БЕЛАРУСЫ"

Нельга так рабіць. Бо ўсе мы беларусы. І беларускамоўныя, і рускамоўныя. А ён паставіў сябе вышэй за астатніх.

**ВАЛЯНЦІН ТАРАС, ПІСЬМЕННІК, БЫЛЫ ПАРТЫЗАН:**

## "НЕЛЬГА БЛЫТАЦЬ ДЗЯРЖАВУ З РЭЖЫМАМ"

У мяне няма адназначнага адказу. Ці прызнаем мы Беларусь незалежнай дзяржавай? Нягледзячы на існуючы рэжым, які нам не даспадобы, і які ў многім не прымаем. Калі мы прызнаем Беларусь незалежнай дзяржавай, то мы павінны пагадзіцца з тым, што беларускае войска – гэта беларускае войска. У якім не выконваецца закон аб мовах. Гэта непрымальна. Мы павінны гэта асуджаць, змагацца з гэтым даступнымі сродкамі. Але наогул не прызнаваць... Тады трэба наогул не прызнаваць Беларусь незалежнай дзяржавай. А тады якой дзяржавы грамадзянін спадар Жалезнічэнка? Якое ў яго грамадзянства? Юрысдыкцыю якой дзяржавы ён прызнае? Нельга блытаць дзяржаву з рэжымам.

**ВАСІЛЬ, БЫЛЫ АФІЦЭР:**

## "СТВОРАНЫ ПРЭЦЭДЭНТ"

Я лічу, што нарэшце створаны прэцэдэнт. З імі трэба змагацца ў іхнім жа прававым полі. "Запоўню дэкларацыю, толькі дайце мне бланк на беларускай мове". Загады буду выконваць толькі па-беларуску. Перакладчыка мне знайдзіце, калі самі не разумееце. Гэта вашы праблемы. Я з вялікай павагай стаўлюся да гэтага ўчынку. Трэба, каб гэта быў не адзін выпадак, навіна году. Калі гэта будуць рабіць часта, кожны дзень, на ўсіх узроўнях і ва ўсіх сферах, усё вырашыцца. Але нехта павінен быў пачаць. Яму пагражаюць гаўптвахты, турмы, дачыненні з ідыётамі, неласкавымі сяржантамі ў капцёрцы. Яго ўчынак не толькі карысны, але і вельмі мужны. Хочацца верыць, што ён стане прыкладам.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "ЁН ЗМУСІЦЬ ВАЙСКОВАЕ КІРАЎНІЦТВА ЗАДУМАЦЦА"

Такі радыкалізм магчымы толькі ў маладосці. Прычым, толькі для маладога чалавека безаглядна зацятага на нейкай ідэі. Мы ўсе разумеем ненармальнасць таго, што ў нашым войску абсалютна не прысутнічае ні беларуская мова, ні беларуская культура, ні гісторыя беларускай ваярскай славы, ні досвед нашых ваяроў мінуўшчыны. Беларускае войска абсалютна не беларускае. Яго, бясспрэчна, трэба пачынаць беларусізаваць. Нейкі малады чалавек вырашыў, што ён можа служыць, слухаць загады і адказваць толькі, калі з ім будуць гаварыць па-беларуску. З аднаго боку, такая адвага і супрацьпастаўленне сябе ўсяму войску, як мінімум, выклікае цікаўнасць. Але разам з тым, я думаю, што яго ўчынак нейкім чынам змусіць задумацца вайсковае кіраўніцтва.

# Адным абзацам




**12 лютага ў Берліне прайшла прэзентацыя штогадовага дакладу праваабарончай арганізацыі «Рэпарцёры без межаў» аб стане свабоды прэсы ў свеце.** Праваабаронцы назвалі 2007 год "асабліва цяжкім для журналістаў у краінах з аўтарытарным рэжымам".

У дакладзе сцвярджаецца, што найбольш рэзка пагоршылася за мінулы год сітуацыя ў Зімбабве і Расіі. У дакладзе змешчана адмысловая карта. Беларусь на ёй пазначаная чорным колерам – таксама, як Куба, Іран, Бірма, Паўночная Карэя, Кітай і інш. Угэтых краінах сітуацыя са свабодай слова найбольш трывожная. Расія пазначаная чырвоным — "складаная сітуацыя". Ва Ўкраіне, Бразіліі, Індыі, Турцыі і многіх іншых, пазначаных святлейшым колерам, у прэсы ёсць праблемы. Добрая сітуацыя – белы колер – толькі ў Канадзе, краінах Скандынавіі, Вялікабрытаніі, Германіі, Грэцыі, а таксама ў краінах Цэнтральнай Еўропы і Балтыі (за выключэннем Польшчы).

**У Доме літаратара ў Мінску будзе офіс прапрэзідэнцкай партыі "Белая Русь".** Усе фірмы, якія зай-



малі памяшканні на трэцім паверсе будынка, ужо выселілі, не працягнуўшы з імі дамоваў. Пра гэта стала вядома пасля таго, як старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі атрымаў адказ на ліст, дасланы кіраўніку "Белай Русі" Аляксандру Радзькову. На канверце з адказам напісаны юрыдычны адрас арганізацыі – г. Мінск, вул. Фрунзе, 5-205, "Белая Русь". Старшыня Саюзу беларускіх пісьменнікаў і кіраўнік Літфонда Алесь Пашкевіч паведаміў Еўрарадыё, што Літфонд з будынка ўжо выселілі. Раней з Дому літаратара быў выселены і Саюз беларускіх пісьменнікаў. Старшыня Мінскай гарадской арганізацыі "Белай Русі" Міхаіл Батура пацвердзіў Еўрарадыё, што юрыдычна арганізацыя мае адрас Фрунзе, 5. Але пакуль "там рамонт". Дырэкцыя Дому літаратара запэўнівае, што нічога пра засяленне "Белай Русі" не ведае.

**13 лютага споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння Пятра Машэрава – кіраўніка ЦК Кампартыі Беларусі.** Гэтая дата ў Беларусі нідзе афіцыйна не адзначалася, хоць за савецкім часам Машэраў быў папулярнай асобай. У вайну ён быў камандзірам партызанскага атрада, камісарам партызанскай брыгады, сакратаром падпольнага абкама ЛКСМБ. Машэраў быў кандыдатам, але так і не стаў членам Палітбюро ЦК КПСС. Загінуў ён 4 кастрычніка 1980 году пад Мінскам у аў-




тамабільнай катастрофе, якая дагэтуль выклікае шмат спрэчак і пытанняў. Імем Машэрава была названая адна з галоўных магістраляў беларускай сталіцы. Але ў 2005 годзе праспект Машэрава ўказам Лукашэнкі быў пераназваны ў праспект Пераможцаў. Гэта выклікала пратэсты многіх ветэранаў.



**Былы кандыдат** *на прэзідэнта Беларусі, лідэр Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч аднавіў паездкі па краіне. Некаторы час таму яму была зроблена аперацыя ў Польшчы. Цяпер палітык зноў вярнуўся да актыўнай дзейнасці. На здымку: Аляксандр Мілінкевіч падчас сутрэчы з жыхарамі сталіцы каля будынка Першамайскага равыканкама, Мінск, 12 лютага 2008 году.*

## Суседзі

# БЕЗ ПАЛІТЫКІ

12 лютага, акурат у дзень візіту прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі ў Маскву, "Газпром" меўся адлучыць гэтую краіну ад газу. Калі ўкраінская кампанія не заплаціць даўгі ў 1,5 мільярда даляраў швейцарскай кампаніі "РосУкрЭнерго".

Шантаж гэтым разам не прайшоў. Юшчанка з Пуціным дамовіліся, што Украіна пачне сплачваць запазычанасць з 14-га лютага. Але самае галоўнае – што газ будзе пастаўляцца не праз пасярэдніцкую фірму, а наўпрост, ад "Газпрома" украінскаму "Нафтагазу".

Без палітыкі ў Крамлі не абыйшлося. Уладзімір Пуцін заявіў, што яму нават уявіць страшна ваенныя аб'екты НАТО ва Украіне, на якія будуць нацэленыя расійскія ракеты…

А вось першы віцэ-прэм'ер Расіі Сяргей Іваноў на канферэнцыі ў Мюнхене адмаўляў, што яго краіна выкарыстоўвае газ ці нешта яшчэ ў мэтах палітычнага ціску на суседзяў. Маўляў, усе краіны Еўропы атрымліваюць яго па рынкавых цэнах – прыблізна па 317 даляраў за тысячу кубоў.

Іванова запыталі – чаму ж тады Беларусь плоціць усяго 119 даляраў? Былы міністр абароны адказаў па-вайсковаму проста. Таму што ў Лукашэнкі няма такіх грошай. "Але бясплатнага газу не бывае", — працягнуў сваю думку віцэ-прэм'ер. Многія назіральнікі зрабілі лагічную выснову. Значыць, РБ расплочваецца за танны газ сваімі прадпрыемствамі, якія даўно жадаюць прыватызаваць расійскія кампаніі. Ці не аб гэтым дамаўляліся Пуцін з Лукашэнкам падчас леташняй сустрэчы ў Мінску?

На жаль, тут можна толькі здагадвацца. Бо, у адрозненне ад Украіны, якая дамаглася ад Расіі празрыстай і яснай схемы платы за газ, дачыненні Беларусі з Расіяй застаюцца тайнай.

**А. Уласаў**

# ЗА НАШУ І ВАШУ СВАБОДУ?

## ЧАМУ ЎЛАДЫ РБ РАЗДЗІМАЮЦЬ СКАНДАЛ ВАКОЛ "КАРТЫ ПАЛЯКА"

Месяц прайшоў дарэмна, калі Мінск з Варшавай не пасварыўся. Чарговай нагодай для скандалу стала "Карта паляка".

Падобна, што БРСМ неўзабаве зноў атрымае загад пілаваць бярвенне перад польскай амбасадай. Бо гэтыя "падступныя панове ладзяць чарговую "правакацыю" супраць сінявокай Беларусі і ствараюць у нашай краіне "пятую калону". Прынамсі, такія высновы можна зрабіць з выказванняў нашых дыпламатаў-аматараў з Нацыянальнага сходу Мікалая Чаргінца ды Сяргея Касцяна.

Зрэшты, не змаўчала і міністэрства замежных спраў. Яно запатрабавала, каб на беларусаў "Карта паляка" не распаўсюджвалася, бо гэта можа парушыць стабільнасць у нашай дзяржаве.

Тут варта патлумачыць, што гэта за дакумент, які можа мець такія лёсавызначальныя наступствы. "Карта паляка" пацвярджае прыналежнасць грамадзяніна іншай дзяржавы да польскага народу. Ейны ўладальнік мае права атрымаць доўгатэрміновую шэнгенскую візу, легальна працаваць або вучыцца ў Польшчы без спецыяльных дазволаў, а таксама займацца там бізнесам. Нарэшце, ён карыстаецца польскай чыгункай са зніжкай – ажно 37%.

Каб атрымаць "Карту паляка", трэба валодаць польскай мовай ці мець сваяка-паляка (альбо грамадзяніна Польшчы), ці давесці сваё польскае паходжанне.

Насамрэч, пэўныя пагрозы для Беларусі гэтае ноў-хаў Польшчы сапраўды стварае. Аднак не палітычныя, а эканамічныя.

Навошта Варшаве спатрэбілася раздаваць такія льготы вялікай колькасці замежных грамадзянаў? У адной толькі Беларусі, паводле папярэдніх ацэнак, на атрыманне "Карты паляка" могуць прэтэндаваць каля 900 тысяч чалавек. Справа ў тым, што колькі часу таму ўсе грамадзяне Польшчы, так бы мовіць, атрымалі "Карту еўрапейца". Пасля таго, як Польшча ўступіла ў Еўразвяз, палякі займелі права легальна працаваць у любой краіне ЕС. І шмат хто ім скарыстаўся, пачаўшы шукаць лепшых умоваў у Францыі, Германіі, Ірландыі, Італіі... Адпаведна, у Польшчы стварыўся пэўны дэфіцыт працоўнай сілы. І яна пачала шукаць замену тым, хто ад'ехаў на Захад, на Ўсходзе.

Між іншым, не адна Польшча разлічвае на экспарт працаўнікоў. Аналагічная сітуацыя склалася ў Літве. Там таксама ёсць свой аналаг "карты паляка", толькі для літоўцаў. І там ужо працуюць тысячы беларусаў.

Таму пагроза палягае ў вымыванні працоўнай сілы з Беларусі. Хаця, калі паглядзець наша тэлебачанне, такой праблемы існаваць не павінна. Бо, паводле БТ, у нашай краіне пануюць дабрабыт і стабільнасць. А ў суседзяў, наадварот, суцэльныя жахі.

Але чамусьці не палякі і літоўцы едуць да нас у заробкі, а зусім наадварот. Мабыць, усё-ткі там лепш? Так, але нашы ўлады ў гэтым ніколі не прызнаюцца. І таму пачынаюць ратаваць становішча, выдумляючы розныя пудзілы кшталту "пятай калоны".

Аднак забаронамі гэтую праблему не вырашыць. І напалохаць усіх – "Не хадзіце, людзі, у Польшчу працаваць" – не атрымаецца. Таму высокапастаўленыя чыноўнікі пачалі навыперадкі абяцаць беларусам імклівы рост заробкаў. Так, прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі заявіў, што абяцанне давесці ў 2010 годзе сярэдні заробак да 500 даляраў, павінна быць перавыканана. А старшыня Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч наогул пасуліў, што ў 2015 годзе беларус будзе зарабляць не менш за 1000 еўра.

Аднак пакуль што рэкорды б'е толькі інфляцыя: за апошнія тры месяцы яна склала 7,3%. У гэтых неспрыяльных умовах палітыкам застаецца толькі адно – загаворваць зубы шараговым грамадзянам. Асабліва гэтае майстэрства запатрабаванае, калі на даляглядзе з'яўляецца прывабная альтэрнатыва.

Між іншым, "карты паляка" яшчэ не існавала нават у праекце, а сотні тысяч беларусаў ужо здабывалі сабе сродкі на існаванне не на Бацькаўшчыне, а ў Расіі. Можа нашаму МЗС з гэтай нагоды заявіць пратэст Крамлю?

Насамрэч, шлях вырашэння гэтай праблемы даўно вядомы. Калісь па тэлебачанні круцілі рэкламны ролік, у якім зацятыя служакі падразалі птушкам крылы, каб тыя не адляцелі ў іншыя краіны. На гэта расейскі імператар прапанаваў іншы рэцэпт: "Кормить надо лучше – они и не улетят".

Аднак беларускія ўлады вырашылі ператварыць эканамічную праблему ў палітычны скандал. Хаця наўрад ці гэта спыніць тых, каго завабяць прывілеі, што дае "Карта паляка".

**Валеры Філін**

# МАРЫ І

## ІНФЛЯЦЫЯ АТАКУЕ...

У студзені спажывецкія цэны ў Беларусі выраслі на 2,5%. Гэтая лічба ідзе ў разрэз з ранейшымі прагнозамі ўраду.

Планавалася, што за сёлетні год інфляцыя дасягне максімум 6-8%. Менавіта такія лічбы і агучыў на пачатку 2008 году прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Савета міністраў. Услед за ім старшыня Нацбанка РБ Пётр Пракаповіч заявіў, што паказчык інфляцыі ў студзені складзе ўсяго толькі 0,8—0,9%. Аднак, паказчыкі, прадстаўленыя Міністэрствам статыстыкі РБ, ператвараюць прагнозы ў недасягальную мару.

Урад знайшоў чарговае тлумачэнне: маўляў, новы віток інфляцыі вынікае з... падвышэння тарыфаў на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі (ЖКГ). За кошт гэтага спажывецкія цэны ўзраслі на 1,6%. Урад пярэчыць самому сабе – з аднаго боку, скардзіцца на адміністрацыйнае рэгуляванне цэнаў, з другога – сам іх рэгулюе з дапамогай тарыфаў. Атрымліваецца, правая рука не ведае, што робіць левая.

На люты і сакавік Нацбанк вуснамі свайго кіраўніка Пракаповіча зноў дае аптымістычны прагноз – рост цэн не перавысіць 0,5-0,6% за месяц.

Праўда, гэтым разам Пракаповіч зрабіў важную агаворку – такі паказчык інфляцыі чакаецца толькі "ў выпадку недапушчэння чарговага адміністрацыйнага павышэння цэнаў". А такое павышэнне акурат можа здарыцца – Міністэрства гандлю і Міністэрства сельскай гаспадаркі выступілі (газета "Свабода" пра гэта пісала ў мінулым нумары – А.М.) з ініцыятывай павысіць закупныя і раздробныя цэны на мясную і малочную прадукцыю – ад 14 да 47%. Калі гэта будзе зроблена, рост інфляцыі забяспечаны.

Пры такіх тэмпах пра выкананне гадавога задання па

Эканоміка

# РЭАЛЬНАСЦЬ

інфляцыі можна будзе забыць праз два-тры месяцы. За апошнія тры месяцы рост цэнаў у Беларусі склаў 7,3% . Да 6-8% інфляцыі зусім блізка.

Ну, а пакупнікам давядзецца рыхтавацца да новых цэннікаў у крамах. Беларускі "эканамічны цуд" пачынае прабуксоўваць усё больш заўважна. А інфляцыя ўсё больш раскручваецца.

## І "СЕСЦІ НА ТРУБУ" НЕ ЎДАЛОСЯ

Чарговае пацяпленне ў адносінах паміж Беларуссю і Расіяй дало падставы для новых размоваў пра будаўніцтва другой ніткі газаправоду "Ямал-Еўропа" праз Беларусь. Аднак, гэтым надзеям кіраўніцтва РБ таксама, відаць, не выпадае ажыццявіцца ў рэальнасці. Прынамсі, у блізкім часе.

Афіцыйны Мінск усімі сіламі падтрымліваў ідэю будаўніцтва гэтай ніткі ўжо шмат гадоў. Бо перспектыва "сесці на трубу" падаецца вельмі прывабнай. І справа нават не ў тым, што Беларусь тады пачне атрымліваць дадатковыя сродкі на пампаванне за мяжу транзітнага газу, хоць гэта і немалыя сумы. Галоўнае ў гэтым пытанні – кантроль за трубой. Скіраваўшы асноўны паток свайго прыроднага газу на Захад праз Беларусь, Расія трапіла б у сур'ёзную залежнасць ад яе кіраўніцтва. Яно ў кожны момант магло б перакрыць вентыль альбо пачаць несанкцыянаваны адбор паліва, як гэта ўжо здаралася ў мінулым. І тым самым – эфектыўна шантажаваць "Газпром" і Крэмль, дамагаючыся саступак і прэферэнцыяў.

Таму кіраўнік РБ так дамагаўся хутчэй пачаць будаўніцтва другой ніткі газаправоду, якая пройдзе праз тэрыторыю краіны. Летась у кастрычніку, на прэс-канферэнцыі для расійскіх рэгіянальных СМІ ў Мінску Лукашэнка выказаў меркаванне, што другую нітку трэба "будаваць неадкладна".

Але ў Крамлі таксама ўсё цудоўна разумеюць. І, не жадаючы звязвацца з кім бы то ні было, Расія запусціла праект Nord Stream – "Паўночны паток". Гэты газаправод расійскі канцэрн збіраецца пракласці на дне Балтыйскага мора, то бок, у абход Беларусі. Як гэты праект высмейваў і крытыкаваў Лукашэнка! Маўляў, гэты трубаправод пройдзе праз мінныя палі. І яшчэ шкоду навакольнаму асяроддзю прынясе. (Што, дарэчы, вельмі верагодна.) Кіраўнік дзяржавы нават абяцаў Маскве падатковыя льготы: "Калі ўжо вы баіцёся, што транзіт праз Беларусь будзе дарагі, мы вам яго "даруем" на пяць гадоў, для таго, каб вы акупілі гэтую трубу. Мы вас на пяць гадоў вызвалім ад падаткаў – пампуйце".

Але надзеі ўладаў РБ пахаваў днямі пасол Расіі ў Мінску Аляксандр Сурыкаў. 11 лютага ён заявіў, што РФ спачатку скончыць будаўніцтва "Паўночнага патоку", а потым ужо будзе глядзець, ці патрэбныя ёй дадатковыя магутнасці для паставак газу.

Словы Сурыкава пацвердзіў і афіцыйны прадстаўнік "Газпрома" Сяргей Купрыянаў у інтэрв'ю радыёстанцыі "Эхо Москвы":

— Альтэрнатывы газаправоду "Паўночны паток" не існуе. Пытанне аб тым, каб яго не будаваць, не стаіць.

А значыць, пра другую нітку "Ямал-Еўропа" ў Беларусі можна забыць надоўга. Пуск першай чаргі "Паўночнага патоку" запланаваны на 2010 год. І гэта толькі першая чарга. Трэба думаць, гэтая "будоўля стагоддзя" зойме ў Расіі бліжэйшыя гадоў дзесяць. Магчыма, пасля гэтага высветліцца, што дадатковыя магутнасці "Газпрому" не патрабуюцца. Так што, пры ўсіх заявах пра дружбу і супрацоўніцтва з Беларуссю, у Крамлі працягваюць мэтанакіравана аддзяляць мух ад катлет, паводле выразу Пуціна.

**Алег Ман**

Гаспадыня

# БЕЛАРУСКАЯ "ХРЭНОЎКА" НА РАСІЙСКІМ СПІРЦЕ

## КАБ ЗАХАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ, У ГОСЦІ ТРЭБА ХАДЗІЦЬ СА "СВАІМ"

"Хрэноўку" робяць на расійскім спірце, але з беларускім хрэнам. Ад самаробнай "смаленскай гарэлкі", якая выабляецца і актыўна спажываецца ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі, "хрэноўка" адрозніваецца – гэта больш далікатны напой. Каб ў хатніх умовах вырабіць "смаленскую гарэлку", трэба развесці вадой з-пад крана прывезены са Смаленска спірт, заліць у бутэльку і наклеіць этыкетку. Гэты нескладаны рэцэпт актыўна рэалізуецца на "кропках" нелегальнымі гандлярамі спіртным, такая гарэлка ў два разы таннейшая за крамную.

Тэхналогія вырабу "хрэноўкі" больш складаная: бяруць карані хрэну, ачышчаюць, пасля пераціраюць на тарцы і засыпаюць ва ўсё той жа разбаўлены вадой спірт. Пасля "хрэноўка" настойваецца – столькі дзён, на колькі хопіць цярпення. Пасля можна дадаць некалькі кропляў лімоннага соку...

А пасля "хрэноўку" п'юць і хваляць: "Які смак прыемны, галава не баліць!" Дбайныя гаспадыні "хрэноўку" разліваюць па бутэльках і выстаўляюць на стол. Пра тое, што выпіў у гасцях менавіта "хрэноўку", а не, напрыклад, "Няміраў", можна даведацца толькі пасля таго, як віп'еш, бо могуць спытаць: "Ці добра табе? Ці смачна? Самі рабілі! Гэта ж хрэноўка!"

І вельмі добра, калі "хрэноўка" не была зроблена на падставе "максімкі" – тэхнічнага спірту, тады ёсць шанец захаваць жыццё і здароўе. А яшчэ лепей, калі ідзеш на госці са "сваім".

У Віцебскай і Магілёўскай абласцях ідзе актыўная барацьба дзяржавы з незаконным расійскім спіртам. У віна-гарэлачных крамах – плакаты з тэлефонамі "гарачай лініі" па барацьбе з сурагатнай прадукцыяй і эмацыйнымі зваротамі да "паважаных грамадзянаў", якім "абрыдлі бруд у пад'ездзе і сходкі п'яных бамжоў". Далей ідзе міліцэйскі слоган: "Мы дапаможам Вам". І прапануецца ананімна паведамляць адрасы кропак, дзе адбываецца незаконны гандаль. Але досыць часта ананімы проста з помсты наводзяць міліцыю на знаёмых, якія насамрэч не распаўсюджваюць сурагатаў. Як сцвярджаюць міліцыянты, толькі ў 30 працэнтах інфармацыя атрымліваецца праўдзівай, а колькасць асобаў, якія набываюць спірт на нелегальных пунктах продажу, паменшылася нязначна.

Сітуацыя прымушае задумацца. У якой ступені спажыўцы абаронены ад атрутнай прадукцыі і ці дастаткова мераў з боку дзяржавы ў справе барацьбы з сурагатным алкаголем? І яшчэ: наколькі гэты самы спажывец хоча, каб яго абаранялі ад сурагатных вадкасцяў? Што рабіць, калі гэты самы спажывец гатовы спажываць усе вадкасці, апрача тых, якія не ўтрымліваюць спірту?

Ці ўсё ж не задаваць ніякіх пытанняў, а пачаць з сябе і перастаць ужываць "хрэноўку"?

**Паліна Качаткова**

Саюздрук

# НАС ВЫРАТУЮЦЬ БАБУЛІ

## АЛЬБО НАШТО ВАМ “КАРТА ПАЛЯКА”, ПСЯ КРЭЎ?!

“Белорусская военная газета” палемізуе з лідэрам БНФ Лявонам Баршчэўскім, які даслаў у рэдакцыю адкрыты ліст з нагоды абразлівага артыкулу Андрэя Максімава.

*«Имеет ли поведение призывника Железниченко историческую подоплеку? Что ж, давайте разберемся и в этом.*

*Партия БНФ, активистом которой является Железниченко, использует символику несостоявшейся «белорусской народной республики» – герб «Пагоня», бело-красно-белый флаг и девиз «Жыве Беларусь!» Но ведь именно эти символы использовали белорусские коллаборационисты, прислуживавшие фашистской Германии в годы оккупации Белоруссии. Единая смысловая цепочка, подтверждаемая флагом, гербом и лозунгом, тянется оттуда, из событий более чем шестидесятилетней давности. Автору статьи в «БВГ» вовсе не нужно было ничего «прицеплять», все уже давным-давно «прицеплено» самими деятелями БНФ. Что, впрочем, конечно же, не одобрил бы участник Великой Отечественной войны майор Петр Борщевский, отец «свядомага».*

А можа, не варта за нябожчыка вырашаць, ці ўхваліў бы ён ці не прынцыповасць і годнасць сына? Гэта па-першае. А па-другое, колькі можна асноўным грахом партыі БНФ выяўляць вернасць нацыянальнай сімволіцы? Пад якой, дарэчы, прымаў прысягу адзін сучасны, менш прынцыповы палітык. Нацыянальная сімволіка ад таго, што яе выкарыстоўвалі калабаранты, не стала




Belzhaba.com

менш нацыянальнай. Ні ў Расіі, ні ва Украіне, ні ў Літве, ні ў Беларусі.

Ці ёсць пагроза Беларусі ад “Карты паляка” – ініцыятывы польскіх уладаў, дзякуючы якой палякі з тэрыторыі былога СССР змогуць без праблем наведваць Польшчу і працаваць там? Адказ дае ў газеце “Рэспубліка” старшыня камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Анатоль Белашэўскі:

*“В Польше элементарно недостает дешевой рабочей силы. Зазывать работяг из южных регионов планеты – чревато, небезопасно. Гораздо выгоднее приманивать тех, кто по менталитету свой, да еще и язык знает, но при этом и не гражданин, а значит, не обладает полным пакетом прав. (…)*

*Я сам родом из Берестовицкого района Гродненской области, родился на самой границе, рос бок о бок с поляками и могу сказать: те, кто хотел уехать в Польшу (жить, работать, учиться), уже сделали это. Кроме того, когда после Великой Отечественной войны проводили демаркацию белорусско-польской границы, жителям нашей и других деревень напрямую сказали: хотите — оставайтесь на территории Беларуси, хотите – живите в Польше. Многие перешли в соседнюю страну. Но большая часть осталась.*

*Эти люди, наши граждане, живут, соблюдая свои традиции, говорят в основном на польском языке, растят детей, ухаживают за могилами предков и не выказывают никакого желания покидать свою родную землю. А значит, не испытывают надобности в подобных приглашениях”.*

Безумоўна, праца на будоўлі аграгарадкоў не ідзе ні ў якое параўнанне з працай на будоўлі варшаўскіх хмарачосаў. Але гэтая “карта” яшчэ аўтаматычна дае права на шэнгенскую візу. І колькі нашага народу знойдзе ў сабе “польскую кроў”, каб аблегчыць сабе дарогу на Захад, можна толькі здагадвацца. Ну, а наконт традыцыяў і павагі дзяржавы да сваіх грамадзянаў лепей запытацца ў сябраў Саюзу беларускіх палякаў, якіх вымусілі з дапамогай КГБ пераабраць сваё кіраўніцтва.

А “Советская Белоруссия” занепакоілася апошнім наступам уладаў на сталічныя кіёскі.

*“Киоски уже начали убирать. Одним из первых «очистили» проспект Машерова. Их там уже практически нет. К примеру, на месте киоска, который много лет стоял на одной из трамвайных остановок, сейчас лишь «голый» навес. Возможно, город от этого и похорошел, но чтобы купить бутылку минеральной воды, мне пришлось идти в соседний магазин, стоять в очереди. Такая вот эстетика...*

*Предложат ли минчанам альтернативу привычным и удобным киоскам? Покажет время. Наверняка уже скоро активизируются бабушки–торговки, которые 10 лет назад «дежурили» практически у каждого магазина и рынка. Вполне может быть, что теперь торговать они будут не только «традиционными» сигаретами, но и пивом, и шоколадом, и жевательной резинкой. О качестве, безопасности и эстетичности таких товаров, понятно, говорить не приходится”.*

Я таксама маральна рыхтуюся да таго, што па дарозе дахаты мне ўжо не пашчасціць купіць ні мінералкі, ні піва, ні цыгарэт, ні цукерак, ні іншай дробязі. Па яе трэба будзе станавіцца ў чаргу ў няблізкім гастраноме. Але гэтым разам “СБ” мяне абнадзеіла. Нас выратуюць бабулі! Пасля адмены льготаў гэты занятак ім прыйдзецца даспадобы.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ДАЙЦЕ ЗНАЦЬ, ДЗЕ РАЦЫЯ

## АБО “КАБ ДА ГУЗІКА ЯШЧЭ І ПАЛІТО”

Я слухаю беларускія радыёстанцыі на сярэдніх хвалях на частаце 612 кГц, і вось ужо месяц, як спынілася трансляцыя Радыё Рацыя. Цэлую гадзіну ў эфіры з 9-й да 10-й гадзіны раніцы – цішыня. А на сайце Рацыі – ніякіх абвестак. І іншыя СМІ не паведамлялі пра тое, што Рацыя спыніла сваю дзейнасць. Дык дзе ж вы падзеліся, даражэнькія? Дайце знаць.

А Еўрапейскае Радыё на гэтай хвалі гучыць. Прыемная навіна – песні на польскай і іншых славянскіх мовах. Вось бы яшчэ пачуць і расказы пра розныя еўрапейскія краіны. Як у тым анекдоце. Знайшоў чалавек гузік і кажа: “Добры гузік, каб да яго яшчэ і паліто”.

Моўная заўвага таксама да Еўрапейскага Радыё. Вядоўца эфіры Святлана Адзінец на мінулым тыдні заявіла: “У гэтую секунду я, Святлана Адзінец, дачыняюся з вамі”. Мілая Святлана, вы б з намі лепей пагаварылі. Папрошу.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# АЎТАСТОП

## НУ І ДЗЕ ЦЯПЕР ТЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ?..

– Да сталіцы падкінеце? Дзякуй. О, і тут стаяць вясёлыя дзяўчаткі. Калі бачу іх – асабліва пры вакзале, – заўсёды думаю: няўжо гэткія могуць кагосьці спакусіць ды яшчэ й за грошы? А яшчэ цікава было б падлічыць, на што ў сучаснай моладзі ідзе больш часу – на секс ці на чытанне? Падазраю, што і ад таго, і ад другога адцягвае інтэрнэт. Да таго ж у наш час ледзь не кожны пасля сарака ўжо імпатэнт. Так што праблема здымаецца сама сабою. А вось з чытаннем справа асаблівая. Бо, калі задумацца, дык уся наша з вамі цывілізацыя, уся культура створана людзьмі, якія чыталі. Бо чытанне – гэта не толькі працэс атрымання інфармацыі, але і занятак, які трэніруе мазгі, фантазію. А новае пакаленне выбірае не толькі “пэпсі”, але і ўсё іншае ў гатовым выглядзе, як жуйку. І пазбягае ўсяго таго, што патрабуе напружваць шэрае рэчыва. Заўважце – ніхто ўжо не гуляе ў шахматы. Усё стараюцца знівеляваць, зрабіць аднолькавым, каб не трэба было “пераключацца” – усюды, па ўсім свеце гэткія самыя “Макдональдсы”, гатэлі, архітэктура, тыя самыя тэлевізары і аўтамабілі. Параўнайце тэлевізійныя праграмы – усе на адзін капыл, усюды той самы кактэйль з серыялаў, шоў ды баявікоў. Кажуць, чалавек – тое, што ён спажывае. У тым ліку, і духоўнае. Некалі ў вёсках пакідалі незамкнёныя хаты. Цяпер адна мая знаёмая знайшла ўрэшце добра аплочваную працу – экспертам па замках! Мы ўсё больш і больш баімся адзін аднаго. Але чым больш баімся, тым больш прагна глядзім і чытаем пра гвалты, крадзяжы і забойствы. Але мы яшчэ не ведаем, што створыць пакаленне, якое ўзгадавалася на гэтай атрутнай глебе. З аднаго боку – шалёны тэхнічны прагрэс: не паспяваем мяняць мабільнікі і кампутарныя праграмы, з другога – скочваемся да ўзроўню неандэртальцаў. Неандэрталец можа цiскаць кнопкі кампутара, але не здольны яго ўдасканаліць. Я думаю, прырода ўключыла пэўны механізм аўтастопу, механізм, калі прагрэс пачынае тармазіць сам сябе, плодзячы асобнікаў, якія не ў стане яшчэ болей раскручваць спіраль развіцця. Адсюль і дэпапуляцыя. Гэта прырода кажа нам: стоп, досыць, не можаце спыніцца самі – спыню вас я.

—Вы бачыце толькі ценявы бок. Але, калі ёсць цені, мусіць быць і святло. Насамрэч свет павольна – павальней, чым бы хацелася, але няўхільна становіцца лепшым. Яшчэ ў часы нашых дзядоў ці прадзедаў як жа многія не маглі вучыцца і рэалізаваць свае таленты толькі таму, што мелі няшчасце нарадзіцца жанчынамі або мець іншы колер скуры. Яшчэ не мінула і пары сотняў гадоў, калі на абодвух паўшар’ях існавала рабства. Дажыло да пенсіі пакаленне, што не бачыла вайны. Знікаюць межы паміж дзяржавамі. Вам шкада рамантыкі вясковага жыцця? Але яно добра выглядае ў кіно ды ў тэатры. На справе гэта пякельная, тупая, жывёльная, штодзённая праца, прычым найчасцей паднявольная, у брудзе, голадзе і холадзе. Чытаюць, кажаце, мала? А раней – хто чытаў? Эліта, паны ды інтэлігенцыя. Вось і цяпер проста ўсё вяртаецца да нормы, да нейкай аптымальнай колькасці. Затое цяпер нельга за чытанне забароненай кнігі трапіць на вогнішча. Усеагульная нівеляцыя і аднолькавасць – але гэта сведчыць пра лёгкасць кантактаў паміж людзьмі. І вось чаго асабліва не выношу – гэта ляманту пра дэпапуляцыю. Шматдзетныя сем’і – прыкмета прымітыўнага грамадства, дзе не ведалі большых задавальненняў, чым капуляцыя ды як засцерагчыся ад цяжарнасці. Да таго ж, там не было сістэмы сацыяльнай дапамогі, пенсій – вось і “стругалі” як найбольш дзяцей, каб было каму дагледзець на старасці. Пры тым мерлі тыя дзеці адно за адным. Гэта цяпер смерць немаўлятка – трагедыя. Што датычыць скаргаў на “кепскую моладзь”, дык гэтак жа бедавалі і скардзіліся жыхары асірыйскай, егіпецкай і рымскай цывілізацый.

– Ну і дзе цяпер тыя цывілізацыі?..

**Алег Аблажэй**

# Фотафакт



**ОНТ праводзіць** *адбор удзельніц на конкурс «Міс Беларусь-2008». Мінск, Нацыянальны інстытут прыгажосці, 11 лютага 2008 году.*

# Невядомая Беларусь

**14 лютага** — дзень святога Валянціна, апекуна закаханых. Натуральна, што і славутыя Валянціны нараджаліся менавіта ў гэты дзень. Напрыклад, беларускі мастак Валенці Ваньковіч, які прыйшоў на свет у 1800 годзе ў вёсцы Калюжыца цяперашняга Бярэзінскага раёну. Гэта ягоны дом-музей ёсць у Мінску акурат за Палацам рэспублікі.

**15 лютага** ў Беларусі традыцыйна адзначаюцца Грамніцы або Стрэчанне, земляробчае свята сустрэчы зімы і лета. Першая назва, як мяркуюць, пайшла ад паганскага бога Грамаўніка, які ўтварае веснавыя навальніцы і дажджы. Людзі казалі — “На Грамніцы — паўзіміцы“ або “Як прыйдуць Грамніцы — скідай рукавіцы“. А другая назва — Стрэчанне — паходзіць ад царкоўнага “Срэцення“, якое народ перарабіў на простае і зразумелае:

*А ў нас сёння Стрэчанне,*
*Зіма з летам стрэлася,*
*Лета зіму піхнула, піхнула*
*І ножачку звіхнула, звіхнула*
*Зіма пайшла плачучы,*
*Лета пайшло скачучы.*

**18 лютага** 1893 году нарадзіўся найбуйнейшы беларускі пісьменнік і вучоны ХХ ст. Максім Гарэцкі.

**19 лютага** 1908 году нарадзіўся беларускі паэт Станіслаў Шушкевіч. Ён найлепей вядомы як аўтар вершаў для дзяцей. А яшчэ вядомы сваім сынам — Станіславам Шушкевічам, кіраўніком Беларусі, за якім краіна набыла незалежнасць.

**20 лютага** 1918 году была выдадзена Першая ўстаўная грамата да народаў Беларусі. Гэты юрыдычны і палітычны акт, прыняты Выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага З’езду, яшчэ не абвяшчаў Беларусь самастойнай дзяржавай. Краіне надаваўся статус аўтаноміі з рэспубліканскім ладам у складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Канчаткова незалежнасць Беларусі будзе абвешчана Трэцяй устаўной граматай крыху больш чым праз месяц, 25 сакавіка 1918 году.

# ХТО З КАНДЫДАТАЎ НА ПРЭЗІДЭНТА ЗША НАЙЛЕПШ ПАДЫЙШОЎ БЫ НА РОЛЮ КІРАЎНІКА БЕЛАРУСІ?

## ВАШЫ АДКАЗЫ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ






КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС
( ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА, ІНДЭКС, ГОРАД, РАЁН, ВОБЛАСЦЬ)
SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185
АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.SVABODABY.NET
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ «СВАБОДЫ», ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM
ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 14.2.2008 23:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, вул.Касцюшкі 18